# МАГЧЫМАСЦІ ВЭБ-ДАДАТКУ “50 МОЎ” ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Ліствановіч А.А., Кармільцава Л.Д.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Дапіра Т.П.*

У працы разглядаецца алгарытм самастойнага вывучэння беларускай мовы пры дапамозе вэб-дадатку. У якасці канкрэтнага прыкладу разглядаецца мабільнае дастасаванне “50 моў”.

У свеце не існуе і ніколі не існавала адзіная сістэма, па якой людзі навучаліся б замежным мовам. Кожная эпоха ўносіць у гэты працэс свае змены, новыя ідэі і тэхналогіі. Зараз мы жывём у час, калі колькасць разнастайных рэсурсаў і матэрыялаў для вывучэння моў дасягнула такога ўзроўню, што чалавеку складана вызначыць, якія менавіта яму вучэбныя дапаможнікі падыходзяць лепш за ўсё.

Інфармацыйнае грамадства, у якім мы зараз знаходзімся — гэта гістарычная фаза развіцця грамадства і эканомікі, дзе асноўную ролю ў жыцці людзей адыгрываюць інфармацыйныя тэхналогіі [1]. Яны так развіліся, што сталі неад’емнай часткай нашага паўсядзённага жыцця. Сёння амаль ніхто не можа абысціся без мабільніка ў кішэні. Смартфон — прылада шматфункцыянальная. Акрамя забеспячэння сувяззю, сучасныя мадэлі здольныя аўтаматызаваць мноства працэсаў жыццядзейнасці, у тым ліку самаадукацыю чалавека.

Сёння востра паўстае праблема няведання беларусамі роднай мовы. Таксама гэтае пытанне датычыцца і замежнікаў, якія маюць патрэбу ў беларускай мове, але яе структура для іх занадта складаная. Зараз сярод моладзі вельмі актуальнай з’яўляецца тэма самавыхавання і развіцця, якая можа дапамагчы ў вырашэнні праблемы пашырэння функцыянавання нацыянальнай мовы ў грамадстве. Гэты працэс можа быць рэалізаваны праз камунікацыю з носьбітамі мовы або выкарыстанне розных крыніц для развіцця моўнай кампетэнтнасці. Адной з такіх крыніц з’яўляюцца дастасаванні (вэб-дадаткі).

Дадатак, прыкладная праграма (англ.: application, application software) — карыстальніцкая камп’ютарная праграма, якая дазваляе вырашаць канкрэтныя прыкладныя задачы карыстальніка [2].

На прасторах Інтэрнэту ёсць сотні вэб-дадаткаў. Прапануем звярнуць увагу на адно з лепшых - “50 моў” (малюнак 1).




Малюнак 1

Дастасаванне прапануе велізарны выбар моў, што дазваляе пашырыць аўдыторыю карыстальнікаў. Прычым з яго дапамогай можна не толькі вывучаць шматлікія мовы, але і рабіць гэта праз выкарыстанне розных моў, гэта значыць камусьці можа быць зручней будзе вывучаць беларускую праз англійскую мову і так далей (малюнкі 2, 3) :


Малюнак 2


Малюнак 3

Гэты вэб-дадатак дазваляе карыстальнікам вывучаць мову праз вельмі пазнавальныя, карысныя, граматна структураваныя раздзелы і прыёмы.




Малюнак 4




Малюнак 5




Малюнак 6

Дастасаванне ўключае ў сабе такія структурныя часткі, як “Размоўнік”, “Лічбы”, “Алфавіт”, “Слоўнік”, “Слоўнікавыя гульні”, “Тэсты на паклёп”, “Супрацьлегласці” і яшчэ шэраг займальных раздзелаў, якія дапамагаюць больш даведацца пра славутасці краіны мовы, якая вывучаецца, і нават пра экстранныя неабходныя нумары тэлефонаў пэўнай дзяржавы.

У размоўніку прадстаўлена 100 асноўных тэм і 3 спосабы іх вывучэння: спіс слоў з аўдыёкантэнтам (малюнак 4), карткі са словамі і тэсты (адзін з варыянтаў прадэманстраваны на малюнку 5).

Раздзел “Алфавіт” прапануе літары з транскрыпцыямі. Таксама магчыма выканаць аўдыётэст, у якім неабходна ўспрымаць літары і адпаведныя гукі на слых. Раздзел “Лічбы” падае некалькі варыянтаў напісання і вымаўлення назваў лічбаў на вывучаемай мове. У частцы “Слоўнік” знаходзяцца словы, якія спатрэбяцца ў паўсядзённым жыцці. Інфармацыя прадстаўлена такім жа чынам, як і ў раздзеле “Размоўнік”, а праверыць сябе можна пры дапамозе тэстаў: “Разуменне прачытанага”, “Разуменне пачутага”. З мэтай спрашчэння ўспрымання матэрыялу дадаткам прапанаваныя раздзелы, у якіх выкарыстоўваюцца гульнявыя метады замацавання ведаў.

Неабходна адзначыць, што галоўнай адметнасцю “50 моў” з’яўляецца варыятыўнасць у выбары мовы і метадах яе вывучэння. Таксама плюсам выступае наяўнасць аўдыёматэрыялаў, што дапамагае лепш засвойваць інфармацыю.

Дадатак магчыма наладзіць пад любога карыстальніка: адрэгуляваць памер тэксту, павялічыць/скараціць паўзу паміж фразамі, што спрашчае працэс навучання.

Адзіны прыкметны недахоп — шмат рэкламы, але ад яе магчыма пазбавіцца, матэрыяльна падтрымаўшы праект невялікай сумай грошай. Гэта не ўплывае на функцыянальнасць прыкладання, таму падтрымка праекта ажыццяўляецца па жаданні карыстальніка.

Зараз беларускую мову актыўна вывучаюць школьнікі, студэнты і нават замежнікі, якім яна патрэбна для таго, каб атрымаць адукацыю і працаваць у Беларусі. Ніхто з іх не можа ўявіць сваё жыццё без смартфона, таму гэты спосаб навучання мове будзе максімальна зручным.

У выніку можна сказаць, што сёння вэб-дадатак “50 моў” з’яўляецца адным з самых папулярных і эфектыўных метадаў вывучэння моў увогуле і беларускай у прыватнасці. У сучасным свеце няма больш глабальнага і ўсёабдымнага рэсурсу за Інтэрнэт. Сусветнае павуцінне дае неабмежаваныя магчымасці для навучання мовам.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Магчымасці інтэрнэту бязмежныя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.delachieve.com/.– Дата доступу: 12.04.2021.*

*2. Дадатак (інфарматыка) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.m.wikipedia.org/wiki/Дадатак_(інфарматыка).– Дата доступу: 12.04.2021.*

*3. У Мінску абмеркавалі, як з дапамогай новых тэхналогій развіваць беларускую мову — круглы стол [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://nn.by/?c=ar&i=24635 – Дата доступу: 12.04.2021.*